# ЯНКА КУПАЛА Ў ПОЛАЦКУ

*Няма ў нас мясціны такой,*
*Дзе не б'ецца Купалава сэрца.*

Максім Лужанін.

Упершыню Янка Купала пабываў у Полацку, паводле ўспамінаў пісьменніка С. Шушкевіча, у 1912 г. праездам. А з лета 1916 да лістапада 1917 г. ён жыў і працаваў тут.

Янка Луцэвіч у канцы студзеня 1916 г. быў прызваны ў армію. Ён служыў старшым рабочым дарожна-будаўнічага атрада Варшаўскай акругі шляхоў зносін. У дакументах Я. Купалы гэтага часу запісана яго воінскае званне: "Ратнік 2-га разраду".

Летам 1916 г. атрад быў пераведзены ў Полацк, працавалі паблізу горада ў Дрэтуні. Разам з Янкам Купалам тут рабілі Ясь Аўлачынскі, муж яго сястры Марыі, і Юльян Раманоўскі, муж сястры Леакадзіі, якія паступілі ў атрад вольнанаёмнымі. Ясь Аўлачынскі быў загадчыкам гаспадаркі, а Юльян Раманоўскі дзясятнікам. Будавалі шасэйныя дарогі на Брусы, Вілейку, Валожын.



**Янка Купала.** 1916 г.

У аўтабіяграфічным лісце, які Я. Купала даслаў Льву Клейнбарту, рускаму савецкаму крытыку і публіцысту, першаму даследчыку творчасці беларускага класіка, ён пісаў: *"Летом 1916 г. из Минска перевели отряд в Полоцк Витебской губернии, куда я и приехал. Из Полоцка в 1917 г. в дни Октябрьской революции я переехал в Смоленск"*. Пра гэта ён таксама паведамляў у аўтабіяграфічных лістах да Івана Белавусава, рускага паэта-перакладчыка, актыўнага папулярызатара творчасці Я. Купалы (ад 6.10.1918), і да Яўхіма Карскага, аднаго з заснавальнікаў беларускай філалогіі (ад 4.10.1919).

Мы ведаем таксама пісьмо Я. Купалы з Полацка да прафесара Браніслава Эпімаха-Шыпілы, ураджэнца Полаччыны (ад 26.09.1916). Б. Эпімах-Шыпіла – выбітны дзеяч беларускай культуры, вучоны, мовазнавец – адыграў значную ролю ў жыцці і творчасці Я. Купалы. Ён спрыяў выданню першага паэтычнага зборніка "Жалейка" Я. Купалы, ён жа памылкова перайменаваў *Янука Купалу ў Янку Купалу*. Паэту імя прыйшлося даспадобы і ён стаў падпісвацца толькі так. Прагнучы адукацыі, у снежні 1909 г. Я. Купала, выкарыстаўшы прапановы прафесара, паехаў у Пецярбург вучыцца і больш як тры гады жыў у кватэры Браніслава Ігнатавіча. З самага пачатку паміж маладым паэтам і прафесарам усталяваліся сяброўскія адносіны, узаемаразуменне і ўзаемападтрымка. Пра гэта сведчыць купалаўскі верш-прысвячэнне "Прафесару Б. Эпімах-Шыпілу з новым 1910 годам". У "Летапісе жыцця і творчасці", змешчаным у 9-м томе 2-й кнігі Поўнага збору твораў Янкі Купалы (Мінск, 2003), запісана: *"1917. Лета. Гасцяваў у фальварку Б. І. Эпімах-Шыпілы, прыязджаючы з Полацка"*. Апошні раз сябры сустрэліся ў ліпені 1933 г. Я. Купала з жонкай прыехаў у Ленінград на запрашэнне кінастудыі "Савецкая Беларусь", якая мела там сталую базу. Як сцісла паведамляюць радкі невялікага мемуарнага артыкула І. Барашкі, тады "не забыўся ён наведаць і свайго настаўніка і мецэната Б. І. Эпімах-Шыпілу".

І ў цяжкія гады Першай сусветнай вайны, у перадрэвалюцыйны перыяд Я. Купала жыў у Полацку. Нялёгкае быццё асвятлялася візітамі сяброў. Так, у Полацку Я. Купалу наведаў Сямён Жывапісцаў, грамадскі дзеяч, мецэнат, ветэрынарны ўрач, у якога Я. Купала гасцяваў каля месяца ў верасні 1915 г. у Арле. Дачцэ С. Жывапісцава Таццяне, тады 19-гадовай дзяўчыне, Я. Купала прысвяціў верш "Арліныя крыллі". Пра сустрэчу з С. Жывапісцавым у Полацку сведчыць фотаздымак, дзе сфатаграфаваны Я. Купала ў вайсковай форме, яго жонка Уладзіслава Луцэвіч і Сямён Жывапісцаў.



**Паўліна Мядзёлка.** 1913 г.

По даручэнні Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны восенню 1917 г. у Полацк да Я. Купалы прыязджала Паўліна Мядзёлка, настаўніца, дзеячка беларускага адраджэнскага руху, удзельніца Беларускага музычнага гуртка ў Вільні, першая выканаўца ролі Паўлінкі ў п'есе Я. Купалы. Ці былі адносіны паміж геніем нашай паэзіі Янкам Купалам і Паўлінай Мядзёлкай толькі сяброўскімі? На гэты конт купалазнаўцы маюць розныя меркаванні. Паводле ўспамінаў "Сцежкамі жыцця" (1974) П. Мядзёлкі, а таксама дадаткаў да іх, апублікаваных у часопісе "Полымя" (№№ 2 – 5 за 1993), гэта было каханне. Але Паўліна аддала перавагу іншаму. Янка Купала склаў своеасаблівы цыкл вершаў, прысвечаных П. Мядзёлцы, куды ўвайшлі творы "Быў гэта толькі сумны сон…", "Сыйду…", "Ўвесь да дна…", "На вуліцы", "Таварыш мой", "Нашто? ", "А яна…", "Пахаванне", "Ночцы". У асобных вершах, напісаных у студзені – ліпені 1915 г., адчувальны песімістычны настрой песняра, звязаны, магчыма, з няпэўнымі ўзаемаадносінамі з Паўлінай. Такая думка гучыць і ў рамане "Як агонь, як вада" Алега Лойкі.

Пра сустрэчу ж у Полацку П. Мядзёлка напісала ва ўспамінах: "Як жа я здзівілася, калі ў яго кватэры пабачыла Уладку Станкевічанку! Аказваецца, яны… пажаніліся, а я і не ведала пра гэта". Далей пра Уладку яна згадала: "Яна засталася такой жа як была, толькі стала быццам спакайнейшай. Як і раней, заўсёды энергічная, рухавая і добрая гаспадыня". А вось пра Я. Купалу ў яе іншае ўражанне: "Янка неяк моцна змяніўся з таго часу, як апошні раз яго бачыла. Быў ён зграбнейшы, прыгажэйшы ў ваеннай форме земскага саюзу, дзе тады працаваў. Але стаў нейкі занадта сур'ёзны, маўклівы, пануры… Я нават і мала бачыла яго дома, хіба толькі за абедам. Заўсёды нечым заклапочаны выбягаў з хаты". Клапаціцца было аб чым: набліжаліся трывожныя падзеі ў свеце, а ў Полацк ужо каторы дзень не даходзілі газеты. Я. Купала як нікому давяраў П. Мядзёлцы, бо падчас сустрэчы ў Полацку перадаў ёй на захаванне некалькі сваіх вершаў "Смейся", "Цару неба і зямлі" і іншых, якія П. Мядзёлка вярнула яму ў 1920 г.

Наведала Я. Купалу ў Полацку і яго сястра Леакадзія Дамінікаўна, яна жыла ў сям'і брата месяц.

У Полацку прайшлі першыя гады сямейнага жыцця Я. Купалы. З Уладзіславай Станкевіч ён ажаніўся ў канцы студзеня 1916 г. у Маскве, а ўжо праз паўгода яны жылі ў Полацку. Уладзіслава Францаўна потым прызнавалася сардэчнай сяброўцы Костцы Буйлянцы (паэтцы Канстанцыі Буйле), якая наведвала маладую пару ў Полацку, як яны, сустрэўшыся ў Маскве з Я. Купалам, "раптам адчулі вялікую блізкасць адно да аднаго… і ўрэшце вырашылі пажаніцца". "Я ніколі аб гэтым не пашкадую, што так здарылася", – гаварыла Уладка сяброўцы. Канстанцыя тады таксама жыла ў Полацку, працавала загадчыцай беларускай кнігарні. Яна пакінула ўспаміны, дзе пісала пра Луцэвічаў: "Жылі яны дзесьці за горадам, у маленькім драўляным доміку, што стаяў у зацішку ў садзе". Пад назвай "Пра дні мінулыя" гэтыя запісы ўвайшлі ў



**Янка Купала з жонкай Уладзіславай Луцэвіч і Сямёнам Жывапісцавым.** 1916 г. Полацк.

зборнік успамінаў пра песняра "Такі ён быў". Я. Купала быў складальнікам і рэдактарам першага зборніка вершаў Буйлянкі "Курганная кветка". Яны неаднаразова сустракаліся ў Вільні і Маскве. К. Буйла прысвяціла Я. Купалу шэраг вершаў: "Звон", "Купала", "Песняру", "Янка Купала", "О не, ты не памёр", "Душа паэта" і інш.

Другі раз Я. Купала прыязджаў у Полацк ужо пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ён наведаў старажытны беларускі горад 10 – 13 мая 1926 г. разам са старшынёй Савета Народных Камісараў БССР Язэпам Адамовічам і народным камісарам асветы Антонам Баліцкім. Паэт сустракаўся з жыхарамі горада, прадстаўнікамі Чырвонай Арміі, настаўнікамі і моладдзю. 13 мая быў пастаўлены абразок па яго п'есе "На папасе". У гэты ж дзень газета "Чырвоная Полаччына" надрукавала "Ліст да палачан", дзе Я. Купала выказаў сардэчную падзяку за цёплы прыём.



**Полацк на старой паштоўцы.** Пачатак XX ст.

Янка Купала ўспамінаў Полацк у запісцы Уладзіміру Пічэту, гісторыку, акадэміку, з якім яны ўдзельнічалі ў выязной сесіі АН БССР у Беластоку (12 – 14 кастрычніка 1940 г.). Праслухаўшы даклад "Барацьба беларускага народа за сваё вызваленне" У. Пічэты, Я. Купала даслаў яму запіску, што сведчыла пра глыбокае веданне паэтам гісторыі Беларусі. У артыкуле "Народмститель" Я. Купала прыгадаў Полацк, які яшчэ ў XIII ст. вёў пераможную барацьбу супраць нямецкіх рыцараў.

Варта таксама адзначыць, што тэма "Янка Купала і Полаччына" звязана і з імем пачынальніка беларускага тэатра Ігната Буйніцкага. Двойчы калектыў Першага беларускага таварыства драмы і камедыі Ігната Буйніцкага выступаў у Полацку – у 1910 і ў 1911 гг. Асаблівым поспехам у першы прыезд трупы, паводле ўспамінаў артыста тэатра Зыгмунта Абрамовіча, карыстаўся харал "А хто там ідзе?" на вершы Я. Купалы. Гэта быў адзін з самых удалых нумароў трупы. У калектыве танцавала і будучая жонка Я. Купалы Уладка Станкевічанка.

Вольга Нікановіч-Сахарава, педагог і пісьменніца, паводле драматычнай паэмы "Сон на кургане" Я. Купалы напісала п'есу – казачную феерыю "На Полацкім замчышчы". У 1927 г. у Дзвінскай беларускай гімназіі па ёй быў пастаўлены спектакль.

І ў наш час прасочваецца сувязь тэатральнага жыцця Полаччыны з імем Янкі Купалы. У рэпертуары Полацкага народнага тэатра пры гарадскім палацы культуры доўгі час была п'еса "Прымакі" Я. Купалы. Узорны юнацкі тэатр-студыя "Гармонія" ў 1982 г. стаў лаўрэатам Рэспубліканскага агляду-конкурсу, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

Што датычыцца ўвасаблення Полацка ў творах Я. Купалы, то варта прыгадаць няскончаную паэму "Гарыслава". Я. Купала меў намер апісаць Полацкае княства, княжанне Рагвалода, захоп Полацка наўгародскім князем Уладзімірам Святаславічам. У лісце да Б. Эпімаха-Шыпілы ад 5 чэрвеня 1912 г. Я. Купала паведамляў пра планы: *«Я, як перапішу (апрацую) начыстую "Паўлінку", думаю напісаць паэмку "Рагнеда", гістарычную рэч з жыцця Полацкага княства»*. Захаваліся "Прадмова", два варыянты першага раздзела гэтай гісторыка-патрыятычнай паэмы і план. На падставе вывучэння аўтографаў паэма датуецца маем 1912 г.

Матэрыялы паэмы сведчаць пра маштабнасць задумы Я. Купалы, драматычнасць канфліктаў, глыбокі філасофскі роздум наконт справядлівасці чалавечых узаемаадносін. Эпічны характар паэмы абумоўлены былінна-рэчытатыўным памерам верша, выкарыстаннем аратарска-публіцыстычных і лірыка-філасофскіх элементаў ва ўрыўках паэмы, якія зберагліся. Яскравае ўяўленне пра гэта дае "Прадмова":

*Гэй, павейце, разгуляйцеся,*
*Ветры вольны, лёгкакрылыя,*
*Над старонкай над крывіцкаю*
*Зашуміце, неўгамонныя.*




**Мемарыяльная дошка на станцыі Баравуха.**
1996 г.

*Паміж небам і зямліцаю*
*Віхрам-птахам пранясіцеся,*
*Леты даўна прамінуўшыя*
*Уздымайце з чорна попелу.*
*Ускалыхніце сэрцам каменным,*
*Звонам-вечам ды ўсё полацкім –*
*Хай звон звонка разгамоніцца*
*Дый раскажа быль бывалую.*
*Быль бывалую пра доч Князеву,*
*Ту красавіцу ненаглядную,*
*Пра ту княжну пра свабодную,*
*Што Рагнедай называлася,*
*А пасля што з гора горкага*
*Стала звацiся Гарыславаю…*

Эмацыйнасць, пачуццё трывогі за лёс Радзімы надалі твору рамантычную ўзнёсласць і манументальнасць. У паэме сустракаюцца літаратурна-кніжныя, рамантызаваныя вобразы і прыёмы. У час працы над творам паэт змяніў назву: пэўна, палічыў, што імя Гарыслава болей адпавядае як вобразу гераіні, так і яе лёсу. Аўтограф урыўкаў "Гарыславы" і яе план дазваляюць меркаваць, што твор пісаўся ў духу класічных узораў лірычнага эпасу славянскіх літаратур (паэм Т. Шаўчэнкі, А. Міцкевіча і інш.).

Пра стасункі Я. Купалы з Полацкам пісаў наваполацкі пісьменнік Міхась Барэйша. Полацкі кампазітар Мікалай Пятрэнка стварыў песню "Вуліца Янкі Купалы" на словы К. Кірэенкі. Маладая паэтка, супрацоўніца бібліятэкі імя Якуба Коласа, таксама новапалачанка, Ірына Бельская і паэт Алесь Замкоўскі з Полацка сталі пераможцамі конкурсу "Верш на юбілей", абвешчанага віцебскай філіяй Саюза беларускіх пісьменнікаў да 125-х угодкаў Янкі Купалы.

Уганараванне імя вялікага беларускага пісьменніка на Полацкай зямлі пачалося з рашэння педсавета паказальнай школы пры Полацкім беларускім педагагічным тэхнікуме назваць школу імем Янкі Купалы. Пастанову ўхвалілі на ўрачыстым сходзе студэнтаў і настаўнікаў полацкіх педагагічнага і ляснога тэхнікумаў. У адказ на просьбу даць згоду, каб школа насіла яго імя, Я. Купала напісаў у Наркамасветы: *"Шчыра дзякуючы за ўвагу, якую мне аказала полацкае настаўніцтва і вучнёўства, надаючы маё імя школе, я проці гэтага нічога не маю, калі Наркамасветы на гэта згодзен"*. Пастановай Наркамата асветы БССР ад 21 мая 1926 г. Практыкавальна-паказальнай школе пры Полацкім беларускім педагагічным тэхнікуме было прысвоена імя Янкі Купалы. Памяшканне школы і педтэхнікума (былі размешчаны ў будынку былой настаўніцкай семінарыі) існавала да 1941 г. У Вялікую Айчынную вайну ўся вуліца была цалкам разбурана. Полацкі педтэхнікум адрадзіўся ў новым будынку, цяпер ёнператвораны ў Полацкі каледж установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава". Тут створаны музей гісторыі ўстановы і, вядома, прысутнічаюць матэрыялы, прысвечаныя Я. Купалу.

У 1996 г. адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі Я. Купалу на станцыі Баравуха пад Полацкам. Ва ўрачыстасцях удзельнічалі паэт ураджэнец Полацка Навум Гальпяровіч і пісьменнік Сяргей Панізнік.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (у той час Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна) у 1920-я гг. набыла частку асабістай бібліятэкі Я. Купалы. Шэсць кніг мелі ўласнаручны подпіс паэта, сярод іх: "Древности Спасо-Ефросиньевского девичьего монастыря в Полоцке" А. Сапунова (отд. отт. Из "Полоцких епархиальных ведомостей", 1885, № 8-10.) і "Церемония встречи, проводов и следования Св. Мощей Преподоб. Ефросинии, Княжны Полоцкой, по Витебской губернии с кратким путеводителем по гор. Полоцку, местом положения Св. Мощей" (Витебск: Губ. тип., 1910).

У Ветрынскай сярэдняй школе створаны музей Б. Эпімаха-Шыпілы, вялікі раздзел у экспазіцыі прысвечаны Я. Купалу, яго стасункам з Полацкай зямлёй.

Адна з вуліц, два завулкі і гарадская бібліятэка Полацка названы імем Янкі Купалы. А рашэннем Наваполацкага выканаўчага камітэта № 183 ад 28 чэрвеня 1982 г. вуліца Піянерская ў Наваполацку перайменаваная ў вуліцу імя Янкі Купалы.

**Валянціна СОПІКАВА.**